# Жыццё і творчасць Цёткі



MyShared



Цётка (Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч) - беларуская паэтэса, грамадскі дзеяч, публіцыст.

Нарадзілася ў фальварку Пешчын, цяпер Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці 15 ліпеня 1876 года ў шляхецкай сям'і. Скончыла Віленскую прыватную сямікласную школу, працавала настаўнікам у вёсцы.

MyShared



У 1902-1904 гадах вучылася на вышэйшых адукацыйных курсах Лесгафта ў Пецярбургу. Атрыманыя веды па медыцыне, гігіене, педагогіцы, батаніцы пасля паспяхова выкарыстоўваліся Алаізай у жыцці. Курсаў П. Лесгафта Цётка не скончыла, але здала экстэрнам экзамен за поўны курс пецярбургскай Аляксандраўскай жаночай гімназіі.

Падчас навучання брала ўдзел у дзейнасці студэнцкага «Кружка беларускай народнай асветы і культуры».

У гэты ж час пачалася яе літаратурная дзейнасць.

MyShared



У 1904 Цётка пераехала ў Вільню, дзе распачала актыўную прапагандысцкую работу, адначасова працавала фельчаркай у Нова-Віленскай бальніцы.

У 1904—05 — дзеячка БСГ (Беларускай Сацыялістычнай Грамады). Пад пагрозай арышту была вымушана ў 1905 на нейкі час пакінуць Вільню, але хутка вярнулася і прыняла ўдзел у выпуску першай беларускай газеты «Наша доля».

MyShared




У 1908—09 Цётка жыве ў Кракаве, вучыцца ў Ягелонскім універсітэце (да 1911), пад чужым пашпартам наведвае Расійскую імперыю. У эміграцыі выходзіць замуж за літоўскага інжынера Сцяпонаса Кайрыса.

Прозвішча мужа дазволіла ёй зноў вярнуцца ў Беларусь, дзе ў 1914 яна пачынае выдаваць у Мінску часопіс для моладзі «Лучынка».

MyShared



У 1915 Цётка прыкладае шмат намаганняў для арганізацыі беларускіх школ і настаўніцкіх курсаў у Вільні, дапамагае ў стварэнні прытулкаў, як сястра міласэрнасці даглядае хворых у тыфозным бараку.

У 1916 памёр бацька, і Цётка паехала на яго пахаванне. У Лідскім павеце лютавала эпідэмія тыфу. Цётка засталася, каб дапамагчы хворым, але сама заразілася і памерла. Пахаваная ў Старым Двары пад Лідай.

MyShared



## Творчасць

Падчас вучобы у Пецярбургу аформіўся і дзейнічаў гурток студэнтаў-беларусаў «Круг беларускай народнай прасветы», Цётка была адной з яго ўдзельнікаў.

Асяроддзе гэтага гуртка шмат у чым вызначыла яе грамадзянскую пазіцыю — актыўная барацьба з царызмам, сацыяльнае вызваленне працоўных, нацыянальнае вызваленне беларусаў.

Тады ж пачалася і літаратурная творчасць Цёткі.

MyShared



У нелегальных выданнях гуртка — «Каляднай пісанцы» і «Велікоднай пісанцы» — былі змешчаны яе вершы «Мужык не змяніўся», «Музыкант беларускі», «Нямаш, але будзе».

Самымі раннімі з вядомых вершаў Цёткі лічацца «Лета» і «Восень», апублікаваныя ў зборніку «Скрыпка беларуская» (1906). У іх па-майстэрску перададзены асобныя моманты сялянскай працы, апісваюцца летнія ігрышчы і восеньскі кірмаш. У цэлым зборнік увасабляе адраджэнскую плынь у творчасці Цёткі.

MyShared




Другі паэтычны зборнік — «Хрэст на свабоду» (1906), які прадстаўляе рэвалюцыйна-змагарскі напрамак яе творчасці.

Уключаныя ў яго вершы «Хрэст на свабоду», «Мора», «Пад штандарам» — сапраўдныя шэдэўры рэвалюцыйна-агітацыйнай паэзіі. Упершыню яны былі раздрукаваны тысячамі экзэмпляраў і распаўсюджваліся сярод паднятых на рэвалюцыйнае змаганне ў 1906. Асноўныя матывы паэзіі Цёткі — любоў да радзімы, да прыроды, самаахвярнае служэнне народу. Рэвалюцыйная палымянасць і тонкі лірызм, спалучэнне імпульснай лірыкі і [illegible] вобразаў — характэрныя рысы яе лірыкі.

MyShared



Цётка — адна з пачынальніц беларускай прозы. Яе апавяданні адлюстроўваюць настроі студэнцкай моладзі «Зялёнка», цяжкі вясковы побыт («Навагодні ліст»), гаротны лёс дзяцей, замучаных нечалавечымі ўмовамі жыцця ў капіталістычным грамадстве «Міхаська».

Апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі» таксама, як і названыя вышэй вершы, друкавалася ў якасці пракламацыі.

Пяру Цёткі належаць кніжкі і падручнікі для дзяцей «Лемантар», «Гасцінец для малых дзяцей», «Першае чытанне для дзетак беларусаў», публіцыстычныя артыкулы і нарысы, даследаванні па гісторыі беларускага тэатра.

MyShared